■ Выбары-2018

# АДНА З ПЯЦІ СКАРГАЎ ЗАДАВОЛЕНА

**У Жлобінскім раёне прэтэндэнт на статус кандыдата ў дэпутаты адстаяла свае права надалей удзельнічаць у барацьбе за мандат дэпутата раённага Савета. Жанчына звярнулася са скаргай у Гомельскую абласную выбарчую камісію. Яе сакратар Васіль ЗУБЕЦ расказаў, што заяўніца паведаміла аб неправамернасці прызнання несапраўднымі подпісаў за яе асобу:**

— Сапраўды, раённая камісія «на вока» вызначыла несапраўднасць подпісаў і не звязалася з выбаршчыкамі. Па хадатайніцтве абласной камісіі раённая камісія выканала гэту функцыю. Некаторыя подпісы пацвердзіліся, некаторыя — не. Але ж у выніку аказалася, што агульны працэнт колькасці сапраўдных подпісаў адпавядае нормам заканадаўства. Такім чынам і прэтэндэнт была зарэгістравана кандыдатам і будзе змагацца за месца дэпутата з моманту рэгістрацыі.

Яшчэ чатыры скаргі, якія падалі прэтэндэнты на дэпутацтва, былі абмеркаваны на пасяджэннях абласнога выбаркама. У двух выпадках грамадзянам было адмоўлена ў рэгістрацыі з прычыны няправільна запоўненых дэкларацый аб даходах: адзін з прэтэндэнтаў не паказаў акцыі, якімі валодае, іншы — прыбыткі ад ставак у букмекерскіх канторах. Яшчэ адна звязана з недакладнасцямі пры зборы подпісаў. Апошняя скарга паступіла з парушэннем тэрмінаў і таму пакінута без разгляду.

Цяпер на 60 месцаў у абласны Савет дэпутатаў прэтэндуюць 145 чалавек. У трох акругах (Ельск, Лельчыцы і Карастаянаўская ў Гомелі) — зарэгістравана па адным кандыдаце. Самы вялікі конкурс на дэпутацкі партфель у Мазураўскай выбарчай акрузе Гомеля. Там пяць грамадзян змагаюцца за месца ў абласным Савеце.

А з 3 лютага ва ўчастковых камісіях можна будзе зверыць наяўнасць сваёй асобы ў спісах выбаршчыкаў і пры неабходнасці ўнесці карэктывы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Надвор'е

# Лютаўскія маразы

## На гэтым тыдні сіноптыкі абяцаюць уначы да мінус 15 градусаў

**Сонечнае і марознае надвор'е будзе ў нас у першую дэкаду лютага, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Сёння ў многіх раёнах чакаецца невялікі снег, слабая мяцеліца. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра будзе мінус 4—10 градусаў, па паўднёвым захадзе прагназуецца 1—3 марозу. У сераду ўначы і раніцай у некаторых раёнах, у асноўным па паўночным усходзе Беларусі, пройдзе кароткачасовы снег. Удзень будзе пераважна без ападкаў. На дарогах месцамі захавацца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 7—13 градусаў (пры праясненнях да 15 марозу). Тэмпература днём складзе ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да 8 маразу па ўсходзе краіны. Уначы ў чацвер па поўдні Беларусі пройдзе снег, раніцай і днём у некаторых раёнах таксама не абыдзецца без кароткачасовага снегу, мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 2 па паўднёвым захадзе да мінус 12 па поўначы краіны, месцамі па Віцебскай вобласці пры праясненнях паветра панізіцца да 15 марозу. Удзень будзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі спецыялістаў, у пятніцу на большай частцы тэрыторыі пройдзе кароткачасовы снег. У некаторых раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2—8 градусаў (пры праясненнях па поўначы да 9—12 марозу), удзень чакаецца ад нуля да мінус 6 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ КАРЭЯ СУСТРЭНЕЦЦА З ФАРМАЛЬНЫМ КІРАЎНІКОМ КНДР

**Лідар Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін сустрэнецца з фармальным кіраўніком КНДР Кім Ён Намам, які прыедзе на адкрыццё Алімпіяды ў Пхёнчхане, абмяркоўваецца і магчымасць гутаркі сам-насам, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Прадстаўнік адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Карэя расцаніў будучы візіт высокапастаўленай паўночнакарэйскай дэлегацыі як дэманстрацыю волі Пхеньяна да паляпшэння адносін з паўднёвым суседам. Пры гэтым у адміністрацыі выказалі гатоўнасць да перагавораў на высокім узроўні з КНДР.

Раней КНДР афіцыйна пацвердзіла, што яе дэлегацыю на Алімпіядзе ў паўднёвакарэйскім Пхёнчхане ўзначаліць фармальны кіраўнік дзяржавы — старшыня прэзідыума Вярхоўнага народнага сходу Кім Ён Нам. Па канстытуцыі ён займае пасаду кіраўніка КНДР, а лідар краіны Кім Чэн Ын лічыцца найвышэйшым кіраўніком КНДР.

## ПІЛОТ СУ-25, ЯКІ ЗАГІНУЎ У СІРЫІ, ПРАДСТАЎЛЕНЫ ДА ЗВАННЯ ГЕРОЯ РАСІІ

**Лётчык Су-25 Раман Філіпаў прадстаўлены міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу да прысвоення звання Герой Расійскай Федэрацыі пасмяротна. Пра гэта паведамілі ў панядзелак у расійскім ваенным ведамстве.**

У міністэрстве абароны нагадалі, што пры аблёце зоны дээскалацыі «Ідліб» для кантролю рэжыму спынення агню Су-25 Філіпава быў збіты тэрарыстамі з ПЗРК.

«Лётчык да апошняга спрабаваў трымаць самалёт у паветры і паспеў далажыць камандаванню, што атакаваны ракетай. Прызямліўшыся пасля катапультавання ў раёне населенага пункта Тэль-Дэбес, падкантрольным тэрарыстам, маёр Філіпаў да апошніх хвілін жыцця вёў няроўны бой са штатнай зброі, не падпускаючы баявікоў. Пасля акружэння тэрарыстамі, будучы цяжка параненым, калі адлегласць да баевікоў скарацілася да некалькіх дзясяткаў метраў, расійскі афіцэр падарваў сябе гранатай», — дадалі ў міністэрстве.

## КЕЙПТАЎН РЫХТУЕЦЦА ДА «ДНЯ ЗЕРО»



**З пачатку лютага норму расходавання вады для жыхароў Кейптаўна скарацілі ўдвая, а да красавіка 4-мільённы мегаполіс можа і зусім застацца без вады.**

На працягу апошніх трох гадоў другі па колькасці насельніцтва горад Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі сутыкаецца з беспрэцэдэнтнай засухай. Кейптаўн і яго наваколлі абвешчаны зонай бедства.

Пры гэтым каля 40 % водных рэсурсаў, якія спажывае Кейптаўн, забяспечвае Тыватэрсклуфская дамба — водны рэзервуар, размешчаны ў Заходне-Капскай правінцыі. За апошнія гады плошча рэзервуара прыкметна скарацілася, а разам з ёй — і колькасць даступнай для жыхароў горада вады.

Ужо ў снежні мінулага года ступень запаўнення вадасховішчаў вагалася ў межах усяго 15—20 %.

Акрамя засухі на спажыванне вады моцна паўплываў рост насельніцтва горада. За апошнія 12 гадоў колькасць жыхароў Заходне-Капскай правінцыі павялічылася на 1,5 млн чалавек, а Кейптаўн прыцягвае працоўных мігрантаў з усёй краіны. Пры гэтым каля 65 % спажывання вады прыпадае на прыватныя дамы і кватэры.

# Доўгачаканы снег прынёс не толькі радасць

**Снегапады, якія прайшлі на Гомельшчыне, прывялі да адключэнняў электраэнергіі і падзення дрэў. Урэшце пашкоджанымі аказаліся больш за дзясятак аўтамабіляў.**

Па 18 мм ападкаў у Гомелі і Мазыры зафіксавана Гомельскім абласным цэнтрам па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя. Гэта, дарэчы, дэкадная норма. З-за парываў ветру да 11 метраў за секунду і мокрага снегу на Гомельшчыне валіліся дрэвы, дадаткова «нагружаныя» наледдзю.


Фота БЕЛТА.

У Светлагорскім, Веткаўскім і Лельчыцкім раёнах ратавальнікі выцягнулі са снежных намецяў тры аўтобусы і два аўтамабілі. У Буда-Кашалёўскім раёне ў снежную пастку трапіла машына хуткай медыцынскай дапамогі, якая рухалася да хворага. Яшчэ 9 аўтамабіляў спецыялісты МНС выцягвалі з кюветаў. Некалькі разоў праводзіліся работы па распілоўцы дрэў, якія зваліліся на праезную частку.

З-за непагадзі ў Гомельскім, Калінкавіцкім і Веткаўскім раёнах парушалася электразабеспячэнне. Супрацоўнікі МНС аказвалі дапамогу перасоўнымі дызель-генератарамі. У тым ліку іх прыйшлося прымяніць, каб забяспечыць даенне кароў на ферме ААТ «Прудкоўскае» ў вёсцы Шарэйкі Калінкавіцкага раёна. Выратоўваць прыйшлося інтэрнат для састарэлых і папраўчую калонію-пасяленне № 21 у Веткаўскім раёне. У пасёлку Прыбар пад Гомелем падавалі мабільнае цяпло ў жылы фонд, сярэднюю школу і прафесійны аграрна-тэхнічны ліцэй. Дапамога спатрэбілася таксама Шарпілаўскай сярэдняй школе і аддзяленню пошты.

Для ліквідацыі наступстваў снегападу Гомельскі абкам БРСМ тэрмінова вывеў сваіх валанцёраў на акцыю «Чысты двор». Вызваляць пажылых людзей, ветэранаў і інвалідаў, якія апынуліся ў снежнай аблозе, дапамагаюць члены атрада «Добрае сэрца» і маладзёжных груп аховы правапарадку. Акрамя таго, ва ўсіх раёнах вобласці камітэты БРСМ арганізавалі маніторынг сітуацыі па кантролі за ліквідацыяй наступстваў непагадзі. Калі патрэбна дапамога па прыборцы снегу, можна тэлефанаваць на гарачыя лініі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Здарэнні

# Затрыманы хлопец, які нападаў на жанчын

**У сталіцы каля дзвюх гадзін ночы аператыўнымі супрацоўнікамі ГУУС Мінгарвыканкама затрыманы 26-гадовы хлопец, які падазраецца ў здзяйсненні нападзенняў на жанчын з выкарыстаннем нажа.**

Раней прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама ўжо паведамляла аб вышуку мужчыны, які нападаў на жанчын у сталічным мікраране Серабранка. Пагражаючы нажом, зламыснік спрабаваў згвалціць ахвяру, а таксама завалодаць яе маёмасцю. У студзені ў лясным масіве на вуліцы Якубава была згвалтаваная 18-гадовая мінчанка, а ў дачыненні да яшчэ дзвюх жанчын спробы нападзення не былі даведзены да канца з прычыны ўмяшання мінакоў.

Каля дзвюх гадзін ночы на вуліцы Малініна ў поле зроку супрацоўнікаў міліцыі трапіў хлопец, які быў падобны па прыкметах на злачынцу, якога вышуквалі. Пры правядзенні вобыску ў маладога чалавека быў знойдзены кухонны нож. Хлопец быў дастаўлены ў Ленінскі РУУС. Знаходзячыся ў раённым упраўленні, малады чалавек прызнаўся ў злачынстве і раскаяўся ў зробленым. Супрацоўнікам міліцыі ён растлумачыў, што здзяйсняў злачынствы дзеля сексуальнага задавальнення і матэрыяльнага ўзбагачэння. Для таго каб увесці праваахоўнікаў у зман, зламыснік пераапранаўся ў розную вопратку, а бачныя татуіроўкі на целе старанна хаваў элементамі адзення. Затрыманы раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу, афіцыйна нідзе працаўладкаваны не быў, часам падпрацоўваў на аўтамыйцы. Падазраванаму можа пагражаць тэрмін пазбаўлення волі да 10 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Пайшоў па дровы і заблудзіў

**У Брэсцкім раёне 90-гадовы пенсіянер пайшоў у лес па дровы і заблудзіў.**

Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, жыхар вёскі Рагозы 1928 года нараджэння пайшоў раніцай у лес па дровы. Калі да вечара пенсіянер не вярнуўся дадому, трывогу забіла суседка. На месца неадкладна выехалі супрацоўнікі МНС, РАУС, пагранічнікі са службовым сабакам. Спачатку пошукавая група знайшла сляды ад каляскі, з якой пенсіянер пайшоў у лес. Дзякуючы дакладна ўзятаму кірунку неўзабаве атрымалася знайсці і зніклага мужчыну, які знаходзіўся за шэсць кіламетраў ад дома. Стомлены і змёрзлы, ён не змог растлумачыць, як заблудзіў. Пенсіянера даставілі ў бальніцу, пасля агляду ён быў адпушчаны дадому.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Заяц аказаўся... казуляй

**Сезон палявання на пушнога звера скончыўся, але, на жаль, некаторыя паляўнічыя, што набывалі пуцёўкі на адстрэл зайцоў ды лісіц, усё ж не ўтрымаліся ад спакусы падстрэліць нешта большае.**

Як паведаміў **начальнік Столінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Генадзь СЫСА**, бацька і сын з вёскі Платніца пайшлі паляваць на зайца, а вось вярталіся з казуляй. Тушу жывёліны яны везлі на возе і хоць пры набліжэнні інспектараў спрабавалі яе выкінуць, гэта не дапамагло. Урон, нанесены прыродзе, ацэнены амаль у 3 тысячы рублёў, кошт незаконна здабытай прадукцыі ў 171 рубель. Названы выпадак — не адзінкавы, падкрэслілі ў абласной інспекцыі. У Жабінкаўскім раёне падобным чынам таксама была здабытая казуля, у Кобрынскім — дзік.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**